*Кончевская К.* **Поляки и польский язык на Гродненщине.** Краков : ПАН, 2021. 192 с. (на польск.).

*Канчэўская К.* **Палякі і польская мова на Гродзеншчыне.** Кракаў : ПАН, 2021. 192 с. (на польск.).

*Konczewska K.* **Polacy i język polski na Grodzieńszczyźnie.** Kraków : PAN, 2021. 192 s.

Сацыялінгвістычнае апісанне мовы польска-беларускага памежжа апошнім часам набыло папулярнасць сярод даследчыкаў[1]. Падобныя працы пашыраюць веды пра моўныя асаблівасці гэтага рэгіёна, штодзённае і культурнае жыццё яго насельнікаў. Кніга К. Канчэўскай арганічна папоўніла спіс такіх даследаванняў. Аўтар, якая нарадзілася ў Лідзе, скончыла Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы (вывучала польскую і беларускую філалогію) і значную частку свайго жыцця прысвяціла папулярызацыі польскай мовы і культуры на Гродзеншчыне, характарызуе стан польскай мовы ў гэтым рэгіёне і складаную, спецыфічную сацыялінгвістычную сітуацыю ў ім.

Выданне ўяўляе сабой пашыраную і дапрацаваную версію кандыдацкай дысертацыі, якую К. Канчэўская падрыхтавала пад кіраўніцтвам прафесара Л. Беднарчука і абараніла ў Кракаўскім педагагічным універсітэце ў 2015 г. У працы вывучаюцца асаблівасці жыцця палякаў на Гродзеншчыне і іх польская мова, якая была ўведзена ў польскую літаратуру Э. Ажэшка, а ў дыялектнай і прастамоўнай версіях ужываецца да сёння палякамі ў Гродне і шматлікіх мястэчках, вёсках і былых шляхецкіх ваколіцах на Гродзеншчыне (s. 9). Мэта даследавання – асвятленне ўсіх сфер актуальнай функцыянальнай дыстрыбуцыі польскай мовы на Гродзеншчыне і прадстаўленне яе найбольш характэрных рыс (s. 125).

Кніга складаецца з прадмовы, сямі раздзелаў, васьмі дадаткаў, спісаў карт, фотаздымкаў, дыяграм і табліц, бібліяграфіі і рэзюмэ на польскай, беларускай і англійскай мовах.

У першым раздзеле («Уводзіны») К. Канчэўская характарызуе ступень даследаванасці паўночнаўсходняга перыферыйнага дыялекту польскай мовы (паўночнакрэсовай пальшчызны), прыводзіць гістарычнае апісанне тэрыторыі, якая зараз называецца Гродзеншчынай, адзначае асаблівасці яе вывучэння сацыёлагамі, этнолагамі і мовазнаўцамі і апісвае паходжанне і гісторыю польскай мовы ў рэгіёне. Пэўную ўвагу аўтар аддае некаторым пытанням тэорыі моўных кантактаў.

К. Канчэўская даследуе тыя населеныя пункты, у якіх польская мова яшчэ не вывучалася і ў якіх жывуць нашчадкі прадстаўнікоў розных грамадскіх класаў (як шляхты, так і сялян). Аўтар выкарыстоўвае элементы метадалогіі традыцыйнай дыялекталогіі і сучаснай сацыялінгвістыкі, што, на яе думку, з’яўляецца найбольш аптымальным для аналізу матэрыялу і яго комплекснай характарыстыкі.

Матэрыял даследавання з’яўляецца разнародным і складаецца з наступных частак: 1) аўдыязапісы размоў асоб на акрэсленай тэрыторыі; 2) зафіксаваныя пры любой нагодзе асобныя моўныя формы; 3) польскамоўныя артыкулы ў прэсе і інтэрнэце са свецкіх і каталіцкіх лістоў, у якіх згадваецца Гродна; 4) прамовы і спантанныя пісьмовыя выказванні ксяндзоў; 5) польскамоўныя кніжныя публікацыі; 6) надмагільныя надпісы з даследаванага субрэгіёна.

К. Канчэўская выкарыстоўвала некалькі спосабаў збору матэрыялу: палявыя даследаванні, размовы і назіранні, фіксаванне вытрымак з тэкстаў. Гутаркі запісваліся яўна, радзей прыхавана (калі асобы згаджаліся на фіксацыю размовы, але баяліся, што сам факт запісу спалохае іх і выступіць пэўным абмежаваннем). Даследчыца старалася правесці з інфармантамі пабольш часу, каб паназіраць за іх паўсядзённым жыццём. З мэтай аналізу змен на ўзроўні пакаленняў К. Канчэўская гутарыла як са старэйшымі, так і з маладзейшымі асобамі. Сярод тэм размоў былі наступныя: мова і сітуацыя выбару канкрэтнай мовы, ацэнка яе правільнасці, адносіны да іншых моў; нацыянальная і рэлігійная самаідэнтыфікацыя; гісторыя малой супольнасці і субрэгіёна; традыцыі і звычаі; сямейныя і суседскія адносіны; сучаснае жыццё.

Іншыя часткі матэрыялу К. Канчэўская збірала, калі працавала ў дыяцэзіяльнай газеце «Слова Жыцця» («Słowo Życia»), вывучала мову надмагільных надпісаў, аналізавала рэгіянальную польскую мову ў друкаваных творах пісьменніцы Э. Ажэшка і сучаснага аўтара з-пад Ліды А. Юрэвіча, а таксама ў спантанных пісьмовых выказваннях дзеячаў мясцовых грамадскіх арганізацый.

Урыўкі з размоў, якія выкарыстоўваюцца для сацыялінгвістычнага апісання, падаюцца ў кнізе ў літаратурнай пісьмовай версіі, для строга моўнага матэрыялу ўжываецца паўфанетычны запіс, які адлюстроўвае толькі найбольш істотныя рэгіянальныя рысы. У дадатку змешчана падборка арыгінальных выказванняў інфармантаў з захаваннем іх моўнай формы, аднак аўтар адмовілася ад традыцыйнай транскрыпцыі.

На наш погляд, адсутнасць прыкладаў затранскрыбіраваных вусных размоў і малая колькасць праананалізаваных тэкстаў (пяты раздзел, прысвечаны аналізу дыялектнага матэрыялу, займае ўсяго шэсць старонак, дыялектныя тэксты ў дадатку размяшчаюцца на васьмі старонках), а таксама непрадстаўленасць звестак пра інфармантаў (пол, узрост, адукацыя, род дзейнасці) і сітуацыі камунікацыі

[1] Гл.: *Lewaszkiewicz T.* Język powojennych przesiedleńców z Nowogródka i okolicy. Poznań, 2017 ; Żebrowska A. Komarowszczyzna. Język pogranicza białorusko-polsko-litewskiego. Poznań, 2019 ; Kozłowska-Doda J. Tożsamość, losy i język najstarszych mieszkańców okolic Dociszek na Białorusi (na podstawie badań terenowych z przełomu XX i XXI w.). Lublin, 2021 і інш.

CC BY NC

(месца, час, умовы) робяць аналіз сабранага матэрыялу (яго першай часткі) крыху няпоўным і не вельмі інфарматыўным для чытача, асабліва спецыяліста ў сацыялінгвістыцы. Аўтару варта было б падаць больш звестак пра ўдзельнікаў даследавання і ўмовы правядзення запісаў.

У другім раздзеле («Гістарычнае аблічча даследаваных мясцовасцей») прадстаўлена кароткае апісанне гісторыі месцаў збору матэрыялу з мэтай падкрэсліць іх гістарычна-культурную сувязь і паказаць змены, якія адыгралі важную ролю ў фарміраванні актуальнай сацыялінгвістычнай сітуацыі. Асобна характарызуюцца лёсы палякаў у Савецкай Беларусі (невыкананне імі планаў савецкай улады па стварэнні калгасаў і саўгасаў, увядзенні савецкіх традыцый, заснаванні ў школах палітычных арганізацый для вучняў (піянерскіх і камсамольскіх), дэпартацыя, масавыя арышты, русіфікацыя).

Трэці раздзел («Сучасная сацыялінгвістычная сітуацыя») прысвечаны аналізу нацыянальнага складу абранага рэгіёна і функцыянавання моўных кодаў у ім. Зараз у Гродзенскай вобласці пражывае найбольшая ў Беларусі колькасць асоб, якія дэкларуюць польскае паходжанне. Сярод жыхароў гэтай тэрыторыі польская мова часта асацыіруецца з палякамі, шляхтай, а гаворка «па-просту» – з сялянамі, тутэйшымі.

У рэгіёне пражываюць беларусы (выступаюць карэннымі жыхарамі гэтых мясцовасцей, але складаюць найменшы працэнт насельніцтва ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі Беларусі), літоўцы, расіяне, украінцы. Згодна са статыстыкай 2010 г. асобы, якія сцвярджалі польскую нацыянальнасць, у якасці роднай мовы (па назіраннях К. Канчэўскай, гэта паняцце неадназначнае) называлі беларускую, літоўскую, польскую, рускую. Польскую мову як родную выбралі не толькі тыя, хто адзначаў сваё польскае паходжанне, але і беларусы, літоўцы, украінцы, расіяне, татары, яўрэі.

Па меркаванні інфармантаў, на рускай мове размаўляюць у Расіі і ў беларускіх гарадах, на беларускай – у праваслаўных, былых сялянскіх вёсках. «Простая» мова для іх – гэта «свая» мова, якой карыстаюцца жыхары памежжа (як вёсак, так і гарадоў) у паўсядзённай камунікацыі.

Характарызуючы трасянку, К. Канчэўская робіць слушную заўвагу аб адсутнасці агульнапрынятага азначэння гэтага тэрміна і адназначных крытэрыяў адпаведнай з'явы. Аўтар справядліва адзначае (са спасылкай на беларускіх даследчыкаў) імкненне навукоўцаў у пачатку XXI ст. аналізаваць трасянку з сацыялінгвістычнага ракурсу. К. Канчэўская прыводзіць асноўныя рысы трасянкі: 1) спалучэнне рускіх марфем з беларускай фанетыкай і арфаэпіяй; 2) наяўнасць аўтарскіх лексем, не зарэгістраваных ні ў беларускай, ні ў рускай мове; 3) распаўсюджанне пераважна сярод мігрантаў з вёскі без вышэйшай адукацыі, якая б аўтаматычна звязвалася з абавязковасцю засваення рускай мовы (s. 63). Аднак аўтар не дае спасылкі на крыніцу такога апісання трасянкі, што, на нашу думку, не вельмі правільна, улічваючы неадназначнасць з'явы і розныя погляды даследчыкаў на яе.

Па назіраннях К. Канчэўскай, рэспандэнты польскай нацыянальнасці пераважна разумеюць, што мова, на якой яны размаўляюць, адрозніваецца ад ужыванай у этнічнай Польшчы, і называюць яе «наша польская». Гэта мова – вынік асіміляцыйных працэсаў і прымусовай русіфікацыі, а таксама выключэння польскай мовы з усіх сфер жыцця, акрамя сямейнай і рэлігійнай.

На думку інфармантаў, польская мова – гэта мова строга акрэсленых сфер: каталіцкага касцёла і польскай культуры. «Чыстую» польскую мову можна пачуць на тэлебачанні або радыё, на ёй размаўляюць у Польшчы, «за Бугам». У традыцыйных сем'ях аўтаматычна адбываецца пераключэнне кодаў: па-польску размаўляюць з ксяндзом або ў касцёле (у тым ліку з прыхаджанамі), а таксама з тымі, хто прыбыў з Польшчы.

Прааналізаваўшы маўленне інфармантаў, К. Канчэўская зрабіла выснову аб розным узроўні іх моўнай кампетэнцыі. Старэйшае пакаленне ў размове ўжывала пераважна «нашу польскую» або «простую» мову ў залежнасці ад асяроддзя і тэмы размоў. Асобы сярэдняга пакалення з вышэйшай адукацыяй, якія пражываюць у гарадах, маглі, акрамя вынесенай з дома «мясцовай польскай» або «простай» мовы, дастаткова правільна карыстацца рускай мовай, а асобы таго ж пакалення толькі з базавай адукацыяй разам з «простай» мовай ужывалі трасянку, прызнаючы яе рускай мовай. Інфарманты малодшага пакалення карысталіся або рускай мовай (у горадзе), або «простай» мовай (у вёсцы), але ў залежнасці ад сітуацыі маглі размаўляць таксама па-беларуску і па-польску (калі вывучалі польскую мову ва ўстановах адукацыі).

У чацвёртым раздзеле («Функцыянальнае размеркаванне польскай мовы») апісваецца характар выкарыстання жыхарамі аналізаванага рэгіёна польскай мовы ў сям'і, іншых супольнасцях (клубах, таварыствах і інш.), школе, медыя, касцёле, а таксама на месцах пахавання (на могілках). Так, па меркаванні К. Канчэўскай, на ўжыванне польскай мовы ў сем'ях значны ўплыў аказвае іх змешаны характар (прадстаўнікі маладога пакалення паміж сабой размаўляюць «па-свойму» або «па-просту», а ў кантактах з бабулямі і дзядулямі карыстаюцца мясцовай польскай мовай на беларускай аснове). Больш чыстую польскую мову можна сустрэць сярод інтэлігенцыі. Для нашчадкаў дробнай шляхты

польская мова мае сімвалічную каштоўнасць і выкарыстоўваецца імі не толькі ў сакральнай сферы, але і ў звычайным маўленні.

Шмат увагі К. Канчэўская аддае пытанню польскага школьнага навучання. Аўтар апісвае размеркаванне моў у школьнай адукацыі ў даследаваным рэгіёне ў розныя гістарычныя перыяды. Па назіраннях даследчыцы, з канца XX ст. адносны поспех у галіне польскага навучання мелі толькі прыватныя ўстановы, дзе выкарыстоўваліся польскія падручнікі, праводзіліся адмысловыя мерапрыемствы, выкладчыкі былі носьбітамі польскай мовы і г. д. Зараз польскую мову вывучаюць дзеці не толькі з польскіх, але і са змешаных сем'яў або нават асобы, якія не маюць польскіх каранёў. Іх матывацыя – атрыманне далейшай адукацыі ў Польшчы.

Даследчыца аналізуе асаблівасці польскай мовы ў мясцовых папяровых і электронных СМІ (іх асноўныя тэмы – жыццё палякаў на Гродзеншчыне ў прыватнасці і ў Беларусі ў цэлым, гісторыя гэтых зямель, інфармацыя з Польшчы і ўсяго свету), на сайтах грамадска-культурных польскіх арганізацый, на сайце Гродзенскай дыяцэзіі. Аўтарам устаноўлена наяўнасць у мове гэтых выданняў элементаў паўночнакрэсовай пальшчызны, значная колькасць русізмаў і крэсавізмаў.

Характарызуючы функцыянаванне польскай мовы ў касцёле, К. Канчэўская адзначае змяншэнне на Гродзеншчыне колькасці ксяндзоў з Польшчы і павелічэнне колькасці беларускіх святароў, якія атрымалі адукацыю ў Гродзенскай вышэйшай духоўнай семінарыі. Па назіраннях даследчыцы, усё больш маладых ксяндзоў дрэнна ведаюць польскую мову. Адзначаецца, што доля выкарыстання польскай мовы ў аб'явах і надпісах у каталіцкіх храмах, на касцёльных занятках змяншаецца, а каталіцкі партал Гродзенскай дыяцэзіі з канца 2012 г. функцыянуе толькі на беларускай мове. У парафіях, дзе працуюць маладыя беларускія ксяндзы, касцёл не заўсёды з'яўляецца месцам захавання польскасці (польскай мовы, культуры і г. д.).

К. Канчэўская даследуе рэгіянальныя рысы мовы надмагільных надпісаў на Гродзеншчыне. Гэта надпісы на крыжы, надмагільным помніку або пліце, якія з'явіліся пасля Другой сусветнай вайны. Яны зроблены толькі па-польску і маюць рысы паўночнакрэсовай пальшчызны. Аўтар прыводзіць асаблівасці, звязаныя з графікай, арфаграфіяй, фанетыкай, граматыкай і лексікай. Прааналізаваны матэрыял сведчыць аб працягу традыцыі ўжывання польскай мовы на могілках незалежна ад стану яе захавання.

У пятым раздзеле («Выбраныя моўныя рысы дыялектнага матэрыялу») прыводзяцца некаторыя фанетычныя, марфалагічныя, сінтаксічныя і лексічныя асаблівасці сабранага матэрыялу. У сувязі з дэталёвым аналізам моўнай сістэмы паўночнакрэсовай пальшчызны ў шматлікіх навуковых крыніцах К. Канчэўская абмежавалася толькі схематычным прадстаўленнем найбольш уласцівых гродзенскай польскай мове рыс. Адзначым, што ў падраздзеле, прысвечаным лексіцы, аўтар асобна падае некаторыя рысы, характэрныя для мовы інфармантаў, якія жывуць у былых шляхецкіх ваколіцах (запазычанні з рускай, літоўскай і беларускай моў, рэгіяналізмы, архаізмы). На адрозненні польскай мовы нашчадкаў шляхты і сялян указвалася таксама ў папярэдніх раздзелах. У такіх сітуацыях вельмі не хапае прыкладаў затранскрыбіраваных кантэкстаў.

Шосты раздзел («Рэгіянальная польская мова ў мастацкіх творах і публіцыстыцы») прысвечаны гродзенскаму варыянту польскай мовы ў аповесцях Э. Ажэшка (у мове гродзенскай шляхты яна заўважыла архаічнасць, адсутнасць усходнеславянскіх уплываў і частае выкарыстанне лацінамоўных выразаў) і мове ваколіц Ліды ў «перасяленчых» аповесцях А. Юрэвіча (ён пераносіў у творы мову членаў сваёй сям'і, якія размаўлялі «па-простаму», у іх мове было шмат запазычанняў з рускай і беларускай моў). Аўтар аналізуе таксама рэгіяналізмы ў сучасных публікацыях (на прыкладзе зборніка ўспамінаў аб пачатку адраджэння польскасці на разгляданай тэрыторыі «Jak Feniks z popiołu»).

Сёмы раздзел («Падагульненні і вывады») змяшчае асноўныя вынікі праведзенага К. Канчэўскай даследавання. Аналіз разнастайнага матэрыялу паказаў, што польская мова на Гродзеншчыне да гэтай пары з'яўляецца жывой і ўтрымлівае шмат рыс, якія заўважыла і адлюстравала ў творах яшчэ Э. Ажэшка. Нягледзячы на грамадска-палітычныя і гістарычныя змены, польская мова на Гродзеншчыне захавалася, хоць і змяніўся яе стан і сфера ўжывання. З мовы паўсядзённай камунікацыі да 1939 г. яна ператварылася ў мову, якая зараз ужываецца толькі ў пэўных асяродках. Рускамоўнае атачэнне і нячастае карыстанне польскай мовай маюць непазбежныя наступствы.

У якасці дадаткаў выступаюць прыклады дыялектных тэкстаў (адзначым, што аўтару варта было б прывесці іх фанетычную версію), фрагменты з польскамоўных гродзенскіх друкаваных СМІ і інтэрнэт-старонак (хацелася б пад кожным прыкладам убачыць назву выдання), з пісьмовых выказванняў маладых мясцовых ксяндзоў (на жаль, не пададзена ніякіх звестак пра іх), а таксама асноўныя малітвы і рэлігійныя песні з кірылічным фанетычным запісам, узоры надмагільных надпісаў на каталіцкіх могілках Гродзеншчыны, спіс арганізацый і ўстаноў, карты і фотаздымкі.

Выхад кнігі К. Канчэўскай – важная падзея ў даследаванні мовы памежных польска-беларускіх тэрыторый. Выданне пашырае веды пра функцыянаванне паўночнакрэсовай пальшчызны ў розных сферах, што, безумоўна, надае яму асаблівую значнасць. Пэўную складанасць ва ўспрыняцці матэрыялу выклікае адсутнасць падрабязных звестак пра ўдзельнікаў даследавання і сітуацыі камунікацыі, а таксама непрадстаўленасць прыкладаў затранскрыбіраваных кантэкстаў. Аднак мы ўпэўнены, што праца зойме пачэснае месца ў шэрагу сацыялінгвістычных даследаванняў памежжа.

***Н. В. Яфімава***[2]

[2]*Наталля Васілеўна Яфімава* – кандыдат філалагічных навук; дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Наталья Васильевна Ефимова* – кандидат филологических наук; доцент кафедры белорусского языкознания филологического факультета Белорусского государственного университета.

*Natallia V. Jafimava*, PhD (philology); associate professor at the department of Belarusian linguistics, faculty of philology, Belarusian State University.

Email: *janienka@bsu.by*